ВЫБРАНАЯ СТРАТЭГІЯ

ВІЗІТОЎКА ПРАДПРЫЕМСТВА:

Адкрытае акцыянернае таварыства

«Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод»

Joint Stock Company «MOZYR OIL REFINERY» (JSC «MOZYR OR»)

Таварыства ўваходзіць у склад канцэрна «Белнафтахім».
Год заснавання: 1975-ы, з 1994 года — ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод».
Колькасць працоўных: 4720 чалавек.
Амаль 10% калектыву — кіраўнікі, 17% — спецыялісты, 4% — служачыя, 69% — рабочыя. Больш за палову ўсіх супрацоўнікаў маюць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю.
Сярэдні ўзрост супрацоўнікаў — 39 гадоў, моладзі ва ўзросце да 31 года — 25%.

Асноўныя акцыянеры ААТ «Мазырскі НПЗ»:
• Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь — 42,76% акцый;
• ААТ НГК «Слаўнафта» — 42,58% акцый;
• ТАА «МНПЗ плюс» — 12,25% акцый;
• Фізічныя асобы — 2,41% акцый.

Асноўныя віды дзейнасці: вытворчасць і пастаўка нафтавага паліва, нафтабітумаў, серы і нафтапрадуктаў для наступнай перапрацоўкі.

г. Мазыр-11, Гомельская вобл., 247760, Рэспубліка Беларусь
Тэл.: +375 (236) 37 33 30, 33 07 77, 37 34 99
Факс: +375 (236) 33 78 43
E-mail: office@mnpz.by
Web: http://www.mnpz.by

Mozyr-11, Gomel Region, Republic Belarus, 247760
Тэл.: +375 (236) 37 33 30, 33 07 77, 37 34 99
Факс: +375 (236) 33 78 43
E-mail: office@mnpz.by
Web: http://www.mnpz.by

Якасць — галоўны прыярытэт

Прадукцыя Мазырскага НПЗ заўсёды вызначалася высокай якасцю. Гаворка ідзе ў першую чаргу пра выпуск прадукцыі, якая адпавядае патрабаванням еўрапейскіх стандартаў, бо больш за палову прадукцыі рэалізуецца ў развітых краінах Еўропы.

Сертыфікаты адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці патрабаванням міжнароднага стандарту ISO 9001:2008, сістэмы кіравання навакольным асяроддзем — патрабаванням стандартаў ISO 14001:2004 і СТБ ISO 14001-2005 і сістэмы менеджменту аховы працы — патрабаванням стандарту OHSAS 18001:2007 пацвярджаюць здольнасць арганізацыі заўсёды выпускаць прадукцыю самай высокай якасці з мінімальным шкодным ўздзеяннем на навакольнае асяроддзе і пры бяспечных умовах працы для персаналу.

Напрыклад, бензін АІ-95 стандарту «Еўра-5» адпавядае якасці еўрапейскага стандарту EN-228:2008. Гэты від паліва дазваляе павысіць магутнасць рухавіка, знізіць расход паліва, палепшыць эксплуатацыйныя характарыстыкі аўтамабіля. Для аўтаўладальніка гэта азначае, што рухавік будзе абаронены ад нагару, павялічыцца яго рэсурс і значна знізіцца колькасць шкодных выкідаў у атмасферу.

Начальнік службы якасці і стандартызацыі прадпрыемства Людміла ГАЛАВАНАВА расказвае, што цяпер усе бензіны, дызпаліва і бітумы вытворчасці Мазырскага НПЗ адпавядаюць самым сучасным еўрапейскім патрабаванням:

— Мы, каб стварыць упэўненасць спажыўца ў якасці нашых нафтапрадуктаў, пастаянна праводзім працэдуры пацвярджэння адпаведнасці ў органах сертыфікацыі. Такім чынам не толькі наш пашпарт сведчыць, што якасць нафтапрадуктаў адпавядае ўсім патрабаванням, якія да іх прад'яўляюць тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты, але і незалежны орган сертыфікацыі гэта пацвярджае. Да распрацоўкі тэхнічных рэгламентаў на аўтамабільнае паліва не было нават абавязковага патрабавання на сертыфікацыю прадуктаў, але мы даўно займаліся добраахвотнай сертыфікацыяй нафтапрадуктаў. Такім чынам мы заваёўвалі і заваявалі давер спажыўца да нашай прадукцыі. У 2008 годзе быў распрацаваны тэхнічны рэгламент РБ, якія вызначаў абавязковыя патрабаванні да ўсіх відаў аўтапаліва. Дакумент патрабаваў абавязкова дэкларацыраваць нафтапрадукты таксама ў незалежным органе. З 31 снежня 2012 года ўступіў у сілу тэхнічны рэгламент Мытнага саюза пра патрабаванні да паліва. Зараз мы маем дэкларацыі на ўсе віды паліва, зарэгістраваныя ў Беларускім дзяржаўным інстытуце стандартызацыі і сертыфікацыі. І гэта дае нам права пастаўляць наша паліва ва ўсе краіны Мытнага саюза. Наша лабараторыя вельмі добра аснашчана, яна ўключана ў адзіны рэестр выпрабавальных лабараторый Мытнага саюза і мае права на ўзроўні незалежных праводзіць выпрабаванні для мэтаў дэкларавання на адпавяданне рэгламенту Мытнага саюза. Мы пацвярджаем адпаведнасць не толькі ўнутры сваёй краіны і Мытнага саюза, але і імкнёмся дапамагаць у продажы нашых нафтапрадуктаў на экспарт. У прыватнасці, ва Украіну. І калі ў нас ёсць дзяржаўны сертыфікат Украіны на адпаведнасць іх ДСТУ, гэта мае вялікае значэнне і для продажу нашых нафтапрадуктаў, і для хуткасці праходжання іх праз мытню. Гэта немалаважна ў частцы абарачальнасці вагонапыстэрнаў. Таму ўсе асноўныя віды паліва, якія мы экспартуем, таксама маюць украінскія сертыфікаты на адпаведнасць іх дзяржстандартам. Прыняцце Еўрапейскага рэгламенту REACH у свой час стварыла для нас нямала праблем. Мы добра папрацавалі, каб зарэгістраваць усе нашы экспартныя нафтапрадукты ў еўрапейскім хімічным агенцтве. Зараз пашпарты бяспекі ў адпаведнасці з патрабаваннямі Еўрапейскага рэгламенту распрацаваны.

ААТ «МНПЗ» — лаўрэат 8-га Міжнароднага турніру па якасці краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (2012), лаўрэат Прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў вобласці якасці (2002, 2005, 2010), дыпламант Прэміі СНД за дасягненні ў вобласці якасці прадукцыі і паслуг (2007).

У гармоніі з прыродай

Мазырскі НПЗ, як і любы індустрыяльны аб'ект такога маштабу, у сілу спецыфікі вытворчасці не можа не ўплываць на навакольнае асяроддзе. Кіраванне і кантроль яго стану былі і застаюцца прыярытэтнымі кірункамі вытворчай дзейнасці завода, таму тут вядзецца планамерная работа па ўкараненні мерапрыемстваў, накіраваных на зніжэнне нагрузкі на навакольнае асяроддзе ў зоне ўплыву завода і пры выкарыстанні яго прадукцыі.

У сваёй дзейнасці Мазырскі НПЗ кіруецца прынцыпам строгага выканання заканадаўчых патрабаванняў і стандартаў у вобласці экалогіі, для чаго распрацоўваюцца і ўкараняюцца мерапрыемствы па рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, зніжэнні выкідаў, скідванні забруджвальных рэчываў, утварэнні адходаў, забруджвання глебы, выкарыстанні небяспечных рэчываў. Менавіта таму ўдасканаленне вытворчых працэсаў на заводзе непарыўна звязана з правядзеннем цэлага комплексу прыродаахоўных мерапрыемстваў, накіраваных на зніжэнне негатыўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Вялікая ўвага надаецца ўкараненню прагрэсіўных тэхналогій, якія адпавядаюць існуючым і перспектыўным экалагічным патрабаванням пры праектаванні, распрацоўцы вытворчых працэсаў, новых відаў прадукцыі, а таксама папярэджанню аварыйных сітуацый за кошт бяспечнай эксплуатацыі вытворчых аб'ектаў і стварэнні бяспечных умоў працы.

Такая ахоўная экіпіроўка дазваляе лабаранту Віктару ДУБРОВЕ праводзіць аналіз звадкаванага газу.

Толькі за апошнія гады ў ААТ «Мазырскі НПЗ» былі ўведзены ў эксплуатацыю два новыя блокі абаротнага водазабеспячэння, устаноўка ўтылізацыі серавадародазмяшчальнага газу, станцыя ультрафіялетавага абеззаражвання сцёкавых вод, блок утылізацыі вуглевадародных факельных газаў, сучасныя нафтапасткі і флататары на ачышчальных збудаваннях, высокаэфектыўнае абсталяванне па абязводжванні асадкаў сцёкавых водаў, комплекс па перапрацоўцы нафташламу, установка тактавага наліву бензінаў, якая дазволіла зменшыць як страты нафтапрадуктаў, так і выкіды ў атмасферу. Выкананне прыродаахоўных мерапрыемстваў з'яўляецца асновай паспяховай рэалізацыі экалагічнай палітыкі арганізацыі.

У аператарнай кіравання ўстаноўкай гідраачысткі дызельнага паліва.

Усё для людзей працы

Не толькі высакаякасная прадукцыя і бесперапыннае ўдасканаленне вытворчасці з'яўляюцца прадметам гонару Мазырскага НПЗ. Самым каштоўным рэсурсам кіраўніцтва лічыць сваіх супрацоўнікаў і надае вялікую ўвагу падтрымцы іх ведаў і кампетэнтнасці, стварэнню бяспечных умоў працы, забеспячэнню сацыяльнай абароненасці, пра што сведчыць аб'ёмны сацыяльны пакет, які ахоплівае ўсе катэгорыі персаналу і пенсіянераў арганізацыі. Рашэнне сацыяльных пытанняў у арганізацыі адбываецца ў адпаведнасці з Праграмай сацыяльнага развіцця. Яна складаецца з некалькіх базавых частак, якія ахопліваюць усе сферы жыцця працаўнікоў.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫМІ

Асаблівую ўвагу на прадпрыемстве надаюць здароўю сваіх супрацоўнікаў. Штогод на прадпрыемстве праводзіцца прафілактычны медыцынскі агляд завадчан, якія працуюць у шкодных умовах працы. А тыя, хто працуе ў звычайных умовах, праходзяць яго ў адпаведнасці з калектыўным дагаворам раз на тры гады. Медыцынскім абслугоўваннем супрацоўнікі завода карыстаюцца ў медпункце і ў гарадской паліклініцы №1. Працаўнікам, членам іх сем'яў і пенсіянерам прадпрыемства па льготных пуцёўках даюць магчымасць аздаравіцца і прайсці лячэнне ў санаторыі «Сосны», які належыць ААТ. Штогод летам завод арганізоўвае аздараўленне каля 1000 дзяцей супрацоўнікаў на ўзбярэжжы Чорнага і Азоўскага мораў. ААТ траціць на гэта каласальныя грошы, але ж і работнікі, і іх дзеці застаюцца вельмі задаволенымі. Пры неабходнасці завод аплачвае складаныя медыцынскія аперацыі ці дарагое лячэнне па заявах людзей. З Беларускім рэспубліканскім унітарным страхавым прадпрыемствам «Белдзяржстрах» другі год запар заключаны дагавор добраахвотнага страхавання медыцынскіх паслуг усіх работнікаў прадпрыемства.

СМАЧНА ЕСЦІ

Харчаванне на прадпрыемстве забяспечваюць 7 сталовых на 575 пасадачных месцаў, у якіх штодзень харчуецца каля 2 тысяч чалавек. На працоўныя месцы, якія звязаны з бесперапынным працэсам вытворчасці, па заяўках працаўнікоў гарачыя абеды дастаўляюцца ў спецыяльных тэрмакантэйнерах. Ва ўсіх падраздзяленнях пакоі прыёму ежы абсталяваны неабходным інвентаром і посудам.

РАЗАМ ВЕСЕЛА СПЯВАЦЬ

Вольны час калектыву ААТ «Мазырскі НПЗ» арганізаваны з размахам. Палац культуры, які часам называюць «цэхам добрага настрою», мае асобны будынак з тэатральна-канцэртнай залай на 850 месцаў. За мінулы год яго наведала больш за 96 тысяч чалавек.

Яркія і цікавыя мерапрыемствы займаюць не толькі завадчан, але і ўсіх жыхароў Мазыра. Тут працуюць 17 клубаў па інтарэсах і аматарскіх аб'яднанняў, дзе могуць правесці свой вольны час прадстаўнікі ўсіх узроставых катэгорый, а таксама 25 калектываў мастацкай самадзейнасці, 11 з якіх носяць званне заслужаных, народных або ўзорных. Далёка за межамі Гомельшчыны вядомы калектывы «Свяякі», «Жывіца», балет-студыя «AlexiS», якія прымалі ўдзел у папулярных беларускіх тэлепраграмах, перамагалі ў прафесійных фестывалях, гастралявалі не толькі па Беларусі, але і за яе межамі.

Арганізацыяй вольнага часу работнікаў завода і членаў іх сем'яў займаюцца таксама камітэт фізічнай культуры завода, дзіцячы спартыўна-тэхнічны клуб «Старт» і спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву «Жамчужына Палесся». Вадзім Кілбас адзначае, што пярвічнай прафсаюзнай арганізацыяй «Белхімпрафсаюз» штогод праводзіцца круглагадовая ўнутрызаводская спартакіяда:

— Усе структурныя падраздзяленні абавязкова прымаюць удзел у спаборніцтвах па футболе, валейболе, тэнісе, більярдзе, шахматах, дартсе... Людзі з задавальненнем не толькі разам працуюць, але і адпачываюць.

МОЛАДА — НЕ ЗЕЛЕНА

На працягу апошніх гадоў на заводзе ідзе актыўная змена пакаленняў. Сёння персанал на чвэрць прадстаўлены моладдзю ва ўзросце да 31 года. На плечы Савета маладых працаўнікоў ускладзены стратэгічныя задачы садзейнічаць стварэнню ўмоў для ўсебаковага развіцця моладзі, яе адаптацыі да працоўнага калектыву, далучаць маладых да практычнага вырашэння вытворчых і сацыяльна-эканамічных праблем прадпрыемства, маральнае, патрыятычнае і экалагічнае выхаванне моладзі, падтрымка маладых сем'яў. Савет удзельнічае ў распрацоўцы і ажыццяўленні комплексных праграм прадпрыемства па рабоце з моладдзю, у правядзенні культурнай і спартыўнай работы. Гэта спрыяе фарміраванню здаровага ладу жыцця. Маладыя людзі ўдзельнічаюць у разнастайных экскурсіях, турзлётах, культурна-забаўляльных мерапрыемствах, шэфствуюць над брацкай магілай і арганізоўваюць збор гуманітарнай дапамогі для Мазырскага дзіцячага дома.

Начальнік аддзела сацыяльнага развіцця Вадзім КІЛБАС.

ЗАГАРТОЎКА КАДРАЎ

Толькі што атрымалі дыпломы выпускнікі Мазырскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа, якія на працягу амаль чатырох гадоў вучыліся па спецыяльнасці «перапрацоўка нафты і газу». Усе маладыя спецыялісты, якія атрымалі прафесію «аператар тэхналагічных установак», працаўладкаваны на Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. Прадпрыемства не толькі было ініцыятарам ідэі адкрыцця ў каледжы новай спецыяльнасці, але і стала базавым для праходжання ўсіх практык. На арганізацыю навучальнага працэсу Мазырскаму каледжу былі выдзелены немалыя сродкі. На базе ўстановы адукацыі абсталяваны спецыяльныя кабінеты і лабараторыі, завезены неабходнае навучальнае абсталяванне і матэрыялы для працы ў лабараторыях.

ВЕТЭРАНЫ ЗАСТАЮЦЦА Ў КАЛЕКТЫВЕ

Не абышлі ўвагай у Мазырскім НПЗ і ветэранаў працы. Быць заводскім пенсіянерам тут ганарова і прэстыжна, бо прадпрыемства клапоціцца пра тое, каб, знаходзячыся на заслужаным адпачынку, людзі працягвалі адчуваць сябе членам вялікай заводскай сям'і. Для гэтага, у адпаведнасці з умовамі калектыўнага дагавора, яны маюць магчымасць бясплатна чытаць газету «Мозырский нефтепереработчик», лячыцца ў санаторыі «Сосны», набываючы пуцёўку з заводскай датацыяй, бясплатна пратэзаваць зубы, атрымліваць штоквартальную матэрыяльную дапамогу і іншае. Для працы з заводскімі пенсіянерамі створаны Савет ветэранаў завода, які сумесна з супрацоўнікамі Палаца культуры займаецца арганізацыяй самых розных мерапрыемстваў.

ЧЫСТА ТАМ, ДЗЕ ДАГЛЯДАЮЦЬ

Утрыманне тэрыторый і збудаванняў стаіць у адным шэрагу з вырашэннем вытворчых задач, таму госці з розных куткоў свету, якія бываюць у ААТ, заўсёды адзначаюць высокі ўзровень культуры вытворчасці. Уся тэрыторыя падзелена на сектары, замацаваныя за структурнымі падраздзяленнямі завода з мэтай падтрымання парадку і рэгулярнага догляду насадак. За ўтрыманнем заводскай тэрыторыі вядуць кантроль супрацоўнікі гаспадарчага цэха. У іх структуры ёсць цяплічная гаспадарка, дзе вырошчваецца расада кветак і дэкаратыўных кустоў для высадкі на тэрыторыі прадпрыемства.

ПА ТРАМВАЯХ ЗВЯРАЮЦЬ ГАДЗІННІК

Трамвайнае ўпраўленне — гэта яшчэ адно з унікальных падраздзяленняў ААТ «Мазырскі НПЗ». Сёлета яно адзначае 25-гадовы юбілей: у пачатку жніўня 1988 года першы мазырскі трамвай адправіўся па сваім нязменным дагэтуль маршруце: да завода і назад. Даўжыня маршруту складае каля 20 кіламетраў, якія трамвай праходзіць за 40 хвілін. Штодня мазырскія трамваі перавозяць каля 5 тысяч чалавек. Асноўныя пасажыры — супрацоўнікі вялізнага нафтаперапрацоўчага прадпрыемства, якія карыстаюцца гэтым відам транспарту бясплатна. Аднак нямала і работнікаў іншых прадпрыемстваў прамысловай зоны, а таксама дачнікаў. Нават у час пік, калі побач рухаецца паток аўтамабіляў, гэты транспарт ідзе строга па раскладзе. Сёння мазыран абслугоўваюць каля паўсотні трамваяў, пра стан якіх клапоціцца прадпрыемства. Зразумела ж, і трамвайнае палатно, і абсталяванне трамвайных прыпынкаў — у зоне ўвагі прамысловага гіганта.

Выказваем шчырую падзяку за арганізацыйную і інфармацыйную дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага матэрыялу начальніку рэдакцыйна-выдавецкага аддзела акцыянернага таварыства «Мазырскі НПЗ» Ліліі ДРАГЕЛЬ, а таксама калектыву газеты «Мозырский нефтепереработчик».

Матэрыялы падрыхтавалі Ірына АСТАШКЕВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 400091131

У «СОСНЫ» — ПА ЗДАРОЎЕ

Галоўны корпус санаторыя «Сосны».

Санаторый «Сосны», дзе штогод на льготных умовах можа адпачыць кожны завадчанін з сям'ёй, нядаўна быў капітальна адрамантаваны. Адбылася перапланіроўка пакояў, зроблены рамонт камунікацый, усталяваны шклопакеты, адрамантаваны санвузлы, заменены дах... Таксама капрамонт адбыўся ў медыцынскім корпусе, басейне і іншых пабудовах. Зараз памяшканні, звязаныя паміж сабой, нагадваюць вялізны казачны дом пасярод бору — з добраўпарадкаванай тэрыторыяй навокал.

136 месцаў, на якія разлічаны санаторый, ніколі не бываюць пустымі. Дарэчы, тут ёсць нумары двухмесныя, аднамесныя, люкс і паўлюкс. У двары — універсальнае спартыўнае поле са штучным пакрыццём. Яшчэ адна прасторная спартыўная зала — у самім будынку. Зручная лесвіца вядзе да ракі, добраўпарадкаванага пляжа з раздзявальнямі, стрэшкамі і лаўкамі, прыстасаванымі для спакойнага адпачынку.

Усе карпусы аб'яднаны паміж сабой і для праходжання працэдур не трэба выходзіць на вуліцу — у халодны час такая зручнасць становіцца асабліва актуальнай. Басейн цёплы, з дадатковымі воднымі фізіяпрацэдурамі. Начальнік санаторыя «Сосны» Вадзім Марціновіч гаворыць, што на 70% установа запоўнена супрацоўнікамі завода або членамі іх сем'яў, якія карыстаюцца магчымасцю адпачыць і папраўіць здароўе на льготных умовах. Яшчэ каля 10-15% адпачывальнікаў — заводскія пенсіянеры. Усё, што застаецца свабодным, выкупляюць іншыя арганізацыі або прыватныя асобы. Калі меркаваць толькі па нумарах на машынах, якія знаходзяцца на аўтастаянцы побач — санаторый нафтаперапрацоўшчыкаў добра ведаюць жыхары Расіі.

Санаторый прызначаны для лячэння захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, апорна-рухальнага апарату, сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм, гінекалагічных.

Увогуле ж у трохпавярховым медыцынскім корпусе вядуць прыём усе неабходныя пацыентам урачы: тэрапеўт, неўролаг, фізіятэрапеўт, ёсць стаматалагічны кабінет з самым сучасным абсталяваннем — установкай «СІРОНА».

Магчымасці медыцынскіх і фізіятэрапеўтычных працэдур прадстаўлены вельмі шырокім спектрам. У санаторыі ўжываюцца наступныя метады лячэння: грязелячэнне прывазной граззю возера Сакі (Крым, Украіна), нафталаналячэнне, азакерыталячэнне, водалячэнне (ванны, падводны душ-масаж, душ Шарко, цыркулярны душ), масаж ручны і апаратны, міні-саўна «Кедравая бочка», магнітатэрапія, інгаляцыя лекавымі прэпаратамі, фізіятэрапія, лячэбная фізкультура, механатэрапія, лазня і саўна, плавальны басейн, электрасвятлолячэнне, лазератэрапія, крыятэрапія, транскраніяльная электрастымуляцыя галаўнога мозгу, мультырэзанансная тэрапія токамі (КВЧ-тэрапія), сухія вуглякіслыя ванны («Рэабокс»), фітатэрапія, трэнажорная зала...

У санаторыі ажыццяўляецца здабыча і ўжыванне мінеральнай вады двух відаў. Вада падаецца ў бювет.

Свідравіна №1 глыбінёй 600 м выводзіць на паверхню хларыдна-натрыевыя мінералізаваныя воды са слабашчолачнай рэакцыяй, якія выкарыстоўваюцца для вонкавага ўжывання пры захворваннях сардэчна-сасудзістай сістэмы, апорна-рухальнага апарату, гінекалагічных захворваннях і скурных захворваннях.

Свідравіна №2 глыбінёй 405 м змяшчае гідракарбанатна-хларыдна-натрыевыя воды з мінералізацыяй з павышанай колькасцю гумінавых кіслот і слабашчолачнай рэакцыяй. Яны ўжываюцца для лячэння хранічных гастрытаў, язвавай хваробы страўніка і дванаццаціперснай кішкі, хранічных калітаў, панкрэатытаў, захворванняў печані, мочавыдзяляльнай сістэмы, хвароб абмену рэчываў. Вада з гэтай свідравіны мае незвычайны карычневаты колер (яго даюць менавіта гумінавыя кіслоты, якія з'яўляюцца прыродным антыаксідантам).

Пяціразовае харчаванне адпачывальнікаў — на падставе сямідзённага заказнога меню арганізавана ў сталовай санаторыя на першым паверсе жылога корпуса. Ёсць таксама бар, бібліятэка, більярд, лыжная база, танцавальна-канцэртная зала, настольны тэніс, дзіцячая пляцоўка з каруселямі.

Адрас санаторыя «Сосны» ААТ «Мазырскі НПЗ»:

227760, Гомельская вобласць, в. Стрэльск.
Тэл.: (8 0236) 37 35 77, 37 34 81.
Тэл./факс (8 0236) 37 35 77.
Праезд аўтобусам з горада Мазыра ад прыгараднага прыпынку «Школа №11» да санаторыя «Сосны» ў 8.20, 12.30, 17.40, 20.20.

Намеснік начальніка па лячэбнай частцы Ала ПУНЬКО паказала нам, як працуе міні-саўна «Кедравая бочка».

У санаторным басейне ёсць і такая прыемная водная працэдура.

Бібліятэкар санаторыя Алена ГРАМЫКА з юным чытачом Дзімам.